РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ
І БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

запрашаюць студэнтаў, магістрантаў, супрацоўнікаў навучальных і навуковых устаноў, перакладчыкаў і іншых асоб, якія хочуць удасканальвацца ў беларускай мове і беларусазнаўстве на летні семінар

МІЖНАРОДНАЯ ЛЕТНЯЯ ШКОЛА БЕЛАРУСІСТЫКІ

з 30 чэрвеня па 15 ліпеня 2016 года

АДУКАЦЫЙНАЯ ПРАГРАМА ўключае:

– інтэнсіўны практычны курс беларускай мовы для пачатковага і сярэдняга ўзроўняў (48 гадзін);

– лекцыі па актуальных пытаннях беларускага мовазнаўства, літаратуразнаўства, гісторыі Беларусі, этналогіі, лінгвакультуралогіі;

– па заяўцы навучэнцаў – індывідуальныя кансультацыі з аўтарытэтнымі беларускімі навукоўцамі;

– інтэрактыўныя мерапрыемствы, майстар-класы, круглыя сталы.

КУЛЬТУРНАЯ ПРАГРАМА ўключае:

– экскурсіі па гістарычных мясцінах Мінска і Беларусі;

– наведванне музеяў, выстаў, бібліятэк і іншых культурных устаноў горада і краіны;

– сустрэчы з дзеячамі беларускай культуры, мастацтва і навукі.

АПЛАТА

Навучанне, культурная праграма – за кошт прымаючага боку.

Праезд, харчаванне і пражыванне (гасцініца РІВШ: 15 еўра – пакой на аднаго чалавека, 10 еўра – на 2-х чалавек, 5 еўра – на 3-х чалавек) – за кошт удзельнікаў семінара.

ПРЫЁМ УДЗЕЛЬНІКАЎ. Заяўкі на ўдзел у семінары дасылайце да 2 мая 2016 года з указаннем свайго поўнага імя, краіны, адукацыі, месца працы ці навучання, кантактнай інфармацыі (форма заяўкі прыкладаецца), узроўню моўных курсаў; для трэцяга ўзроўню – прыкладнай тэматыкі індывідуальных кансультацый.

КАНТАКТЫ:

Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”
вул. Маскоўская, 15, каб. 321
220007, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь
Сайт: http://nihe.bsu.by/
тэл./факс (017)-396-30-75,
тэл. (017)-256-08-40
e-mail: kmpnihe@mail.ru

Каардынатар: Макоўчык Святлана Мікалаеўна